Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 13 (663) Пятніца, 7 красавіка, 1967 года. Год выд. XX. Цана 2 кап.

## СУСТРЭЧА ПАКАЛЕННЯЎ

У актавай зале галоўнага корпуса адбыўся вечар, прысвечаны сустрэчы старэйшых бальшавікоў са студэнтамі. На такія мерапрыемствы моладзь заўсёды ідзе з вялікай ахвотай. Яна хоча больш ведаць аб людзях таго часу, на многа пашырыць свае веды аб гісторыі краіны.

Зала, перапоўненая студэнтамі, выкладчыкамі, аспірантамі і супрацоўнікамі, пад апладысменты сустрэла з'яўленне ў прэзідыуме ветэранаў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі прадстаўнікоў старэйшага пакалення Кузьму Мікалаевіча Ганічэнку і Міхаіла Іосіфавіча Караля.

З вялікай прамовай выступіў перад сабраўшыміся Кузьма Мікалаевіч, які знаходзіцца ў радах Камуністычнай партыі з 1918 года. Яго біяграфія апалена баямі грамадзянскай вайны. Колькі разоў прыходзілася твар у твар сустракацца з ворагамі маладой Савецкай улады, каб перамагаць іх у смяротных паядынках! У шэрагах тых, хто штурмаваў Зімні палац быў і Ганічэнка. А колькі цяжкасцей і напружанай працы прыйшлося прыкласці ў барацьбе з кулакамі, у змаганні за калектывізацыю сельскай гаспадаркі...

Успаміны.. успаміны. Колькі іх у Кузьмы Мікалаевіча! Ён расказвае і расказвае, а перад слухачамі ўсплываюць жывыя старонкі стваральнай працы савецкіх людзей, іх паўсядзённы гераізм і моцная энергія на шляху да пабудовы самага светлага грамадства на зямлі.

— Мы верылі ў нашы сілы, — сказаў у заключэнне Ганічэнка,— у наступленне такога часу, калі наша барацьба застанецца добрым успамінам шчаслівай моладзі сацыялістычнай краіны. І як добра цяпер усвядамляць, што нашы мары збыліся, і наша пакаленне цяпер іменна такое, якое мы ўяўлялі толькі ў марах...

Пад бурныя апладысменты на трыбуну паднімаецца другі наш госць Міхаіл Іосіфавіч Кароль. Ён уступіў у рады ленінскай партыі роўна праз год пасля ўстанаўлення Савецкай улады. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя застала яго ў турме. Пасля вызвалення Міхаіл Іосіфавіч доўгі час працуе адказным работнікам у Слуцку. Ад радавога байца да вучонага — такі шлях прайшоў Кароль. Цяпер ён працуе у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя Куйбышэва.

Ад імя шматтысячнага калектыва студэнтаў нашага універсітэта гасцям уручаны каштоўныя падарункі.

У канцы вечара госці сумесна са студэнтамі паглядзелі канцэрт удзельнікаў мастацкай самадзейнасці аўтамабільнага завода.

*На здымку: старэйшыя бальшавікі Кузьма Мікалаевіч Ганічэнка і Міхаіл Іосіфавіч Кароль гутараць са студэнтамі.*

*Фота і тэкст І. АСКІРКІ.*



## ЮБІЛЕЙ НАТХНЯЕ, КЛІЧА



Нядаўна апублікаваны сацыялістычныя абавязацельствы Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна да 50-годдзя Савекай улады. Гэта яскравы дакумент аб узросшых творчых сілах нашага калектыва, аб яго вялікіх магчымасцях і шматграннай дзейнасці ў навуковых даследаваннях, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і выхаваўчай рабоце сярод насельніцтва рэспублікі. Знаёмячыся са зместам гэтага на першы погляд звычайнага выдання, пераконваешся, што супрацоўнікі шматлікіх кафедраў, лабараторый, калектывы факультэтаў рыхтуюць да свята каштоўныя падарункі Радзіме. Гэта і манаграфіі, вучэбнікі і дапаможнікі, лекцыі і даклады на прадпрыемствах і ў калгасах, і навінкі вучэбнага працэсу.

Так, вельмі значныя абавязацельствы ўзяў на сябе ардэнаносны універсітэт Беларусі, ідучы да юбілею Савецкай улады. І гэтыя абавязацельствы паспяхова выконваюцца. Доказам можа служыць дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага калектыву і студэнтаў юрыдычнага факультэта. Нядаўна на пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта быў абмеркаваны ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў і навуковых даследаванняў юрыстамі.

Рыхтуючыся да свята, калектыў гэтага факультэта вядзе работу ў трох напрамках: падрыхтоўка да навуковых юбілейных канферэнцый, датэрміновае выданне навуковых прац і вучэбных дапаможнікаў, завяршэнне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. У сваёй справаздачы сакратар партыйнага бюро Пётр Азаравіч Дубавец адзначыў, што слаўны юбілей натхніў калектыў на новыя творчыя дасягненні. Факультэт поўнасцю падрыхтаваны да канферэнцыі прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў.

Вельмі цікавыя, змястоўныя даклады прадставілі дацэнты В. Ф. Чыгір («Жыллёвая праблема ў СССР і капіталістычных краінах»), Г. А. Павец'еў («Роль савецкага працоўнага права ў выхаванні камуністычных адносін да працы»), І. А. Юхо («У. І. Пічэта—першы гісторык беларускага права») і іншыя выкладчыкі.

Нядаўна, як і намячалася абавязацельствамі, выйшла з друку кніжка Яўгена Аляксандравіча Матвіенкі «Судебная речь». Гэта першая ластаўка, за якой паследавалі яшчэ звыш дзесятка навуковых прац і дапаможнікаў. Сярод іх трэба адзначыць даследаванні па тэорыі і гісторыі беларускага права і дзяржавы. Завяршаецца праца па састаўленню вучэбнага дапаможніка па крымінальнаму праву БССР. Калектыў выкладчыкаў падрыхтаваў такі ж дапаможнік па грамадзянскаму праву. Зданы ў выдавецтвы або завяршаецца праца над такімі манаграфіямі, як «Жыллёвае права» (В. Ф. Чыгір), «Асновы судовай псіхалогіі» (А. В. Дулаў), «Перавышэнне межаў неабходнай абароны» (І. С. Цішкевіч), «Прыгавор і яго выкананне» (Е. А. Матвіенка) і іншыя.

Дацэнты тт. Курылёў, Авакаў, Юркевіч, Чыгір і Драбязка датэрмінова падрыхтавалі, а некаторыя ўжо прадставілі да абароны доктарскія дысертацыі па актуальных праблемах тэорыі і практыкі права. Ёсць упэўненасць у тым, што некаторыя працы будуць абаронены да свята.

### У партыйным камітэце

На тым жа пасяджэнні партыйны камітэт абмеркаваў і справаздачу геолага-геаграфічнага факультэта. Тут таксама шмат робіцца для таго, каб дастойна сустрэць юбілей, каб узняць узровень вучэбна-выхаваўчай працы і навуковых даследаванняў. За апошні час на факультэце арганізоўваюцца цікавыя мерапрыемствы, павысілася роля амаль усіх звенняў.

Больш дзейсным стаў насценны друк, ёсць выдатныя прыклады ў дзейнасці народнага кантролю. Наогул, ёсць чым ганарыцца факультэту, ёсць што перадаваць і другім калектывам. Аднак у прынцыповым абмеркаванні пытання адзначалася, што партбюро (сакратар Ф. С. Фешчанка) яшчэ не выкарыстоўвае ўсе магчымасці для павышэння актыўнасці выкладчыкаў і студэнтаў. На факультэце пакуль што слаба працуе студэнцкая прафсаюзная арганізацыя, па сутнасці яна яшчэ не знайшла свайго месца ў дзейсным выкананні сацыялістычных абавязацельстваў. Гэта не вельмі непакоіла партбюро. Некаторыя камуністы перагружаны грамадскімі даручэннямі, а асобныя камуністы і асабліва камсамольцы стаяць у баку ад агульных спраў факультэта. Члены праверачнай камісіі, сакратар парткома Т. Я. Дударава зрабілі сур'ёзны папрок Ф. С. Фешчанку за тое, што на пасяджэннях партбюро вельмі рэдка абмяркоўваюцца пытанні, звязаныя з навуковай працай выкладчыкаў і аспірантаў, не заслухоўваюцца справаздачы камітэта камсамола і іншых грамадскіх арганізацый. Маюць месца выпадкі парушэння статутнага патрабавання аб калегіяльным рашэнні ўсіх пытанняў.

У прынятай пастанове партком рэкамендаваў, як выправіць недахопы, каб яшчэ больш павысіць авангардную ролю камуністаў і камсамольцаў.

## ГУТАРКУ ВЯДЗЕ СТАРЭЙШЫ КАМУНІСТ



Сярод многіх іншых мерапрыемстваў, што намечаны партыйнай арганізацыяй філалагічнага факультэта ў гонар 50-годдзя Савецкай улады, дастойнае месца адведзена рабоце з маладымі камуністамі. З гэтай мэтай па рашэнню партбюро створана камісія, у склад якой увайшлі член партыйнага бюро прафесар Міхаіл Гапеевіч Булахаў, дацэнт кафедры журналістыкі, адзін са старэйшых камуністаў універсітэцкай партарганізацыі, член КПСС з 1921 года Марк Саламонавіч Зярніцкі, студэнт трэцяга курса аддзялення журналістыкі Пётр Пабока. Складзен і зацверджан план работы камісіі. Вырашана, у прыватнасці, правесці з маладымі камуністамі некалькі гутарак па найбольш актуальных пытаннях нашага жыцця.

Першым крокам на шляху выканання плана камісіяй была гутарка старога камуніста Марка Саламонавіча Зярніцкага. Апіраючыся на канкрэтныя прыклады, Марк Саламонавіч гаварыў аб тым, якім павінен быць камуніст, аб яго высокім абавязку перад народам.

Зацікаўленасць маладых камуністаў да расказу ветэрана партыі не спадала на працягу ўсёй гутаркі. У заключэнне яе Марк Саламонавіч Зярніцкі заклікаў кожнага з гонарам несці высокае званне члена КПСС.

Пацікавіўся т. Зярніцкі і думкамі маладых камуністаў адносна дзейнасці факультэцкай партарганізацыі і яе бюро. Маладыя члены партыі тт. Някрасаў, Малыш, Краснеўскі і іншыя выказалі некаторыя заўвагі па далейшаму паляпшэнню яе работы.

Р. ЛІСАЎ.

# ВУЧЭБНАМУ ПРАЦЭСУ— НАВУКОВУЮ АСНОВУ

*У МІНУЛУЮ ПЯТНІЦУ Ў АКТАВАЙ ЗАЛЕ ГАЛОЎНАГА КОРПУСА АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭННЕ АБ'ЯДНАНАГА ВУЧОНАГА САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА, НА ЯКІМ БЫЛІ АБМЕРКАВАНЫ ПЫТАННІ ВЫКАНАННЯ ПАСТАНОВЫ ЦК КПСС І САВЕТА МІНІСТРАЎ СССР «АБ МЕРАХ ПА ПАЛЯПШЭННЮ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ І ЎДАСКАНАЛЕННЮ КІРАЎНІЦТВА ВЫШЭЙШАЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫЯЙ У КРАІНЕ». З ДАКЛАДАМ ПА ГЭТАМУ ПЫТАННЮ ВЫСТУПІЎ УДЗЕЛЬНІК УСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЫ РАБОТНІКАЎ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ У МАСКВЕ ПРАРЭКТАР ПА ВУЧЭБНАЙ РАБОЦЕ А. Я. МАЛЫШАЎ. НІЖЭЙ МЫ ДРУКУЕМ СПРАВАЗДАЧУ ГЭТАГА ПАСЯДЖЭННЯ, У ЯКІМ ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ ПРАФЕСАРЫ І ВЫКЛАДЧЫКІ ЎСІХ ФАКУЛЬТЭТАЎ.*

Савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ідзе з вялікімі дасягненнямі да слаўнай падзеі ў жыцці нашай дзяржавы — 50-годдзя Савецкай улады. У дакладзе А. Я. Малышава адзначалася, што Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна разам з усёй вышэйшай школай краіны рыхтуе дастойную сустрэчу юбілею. Кожным факультэтам, кожнай кафедрай, кожным выкладчыкам асабіста ўзяты канкрэтныя сацыялістычныя абавязацельствы, якія паспяхова выконваюцца. Пад гучныя апладысменты прамоўца віншуе прафесараў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў з высокай узнагародай універсітэта і групы вучоных. Гэта радуе нас, натхняе на новыя поспехі, але ў нас яшчэ ёсць шмат нявырашаных пытанняў, аб якіх вялася вялікая гутарка ў Маскве на Усесаюзнай нарадзе работнікаў вышэйшай школы.

XXIII з'езд КПСС паставіў перад вышэйшымі навучальнымі ўстановамі задачу значнага паляпшэння кіраўніцтва вну, якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Гэтага настойліва патрабуюць жыццё, развіццё вытворчасці, навукова-тэхнічны прагрэс. Краіна чакае ад вышэйшай школы высокаадукаваных спецыялістаў, выдатна ўзброеных марксісцка-ленінскай тэорыяй, дэталёва ведаючы эканоміку, метады кіравання, прынцыпы навуковай арганізацыі працы.

Ужо даўно пройдзен той этап у развіцці нашай краіны, калі спецыяліст на працягу многіх год мог забяспечваць даручаны яму ўчастак працы на аснове запасу ведаў, атрыманых у вну. Бурны прагрэс народнай гаспадаркі ў цяперашні час можа быць забяспечан толькі ў тым выпадку, калі ва ўсіх яго галінах будуць своечасова ўкараняцца навейшыя дасягненні перадавой навукі і практыкі. Таму з кожным годам вялікае значэнне атрымліваюць такія якасці спецыяліста, як імкненне да паўсядзённага самаўдасканальвання і творчага пошуку, уменне сачыць за навуковым і тэхнічным працэсам, сусветнай літаратурай і самастойна прымяніць атрыманыя веды ў канкрэтных справах даручанага ўчастка працы.

У рабоце вышэйшай школы, як справядліва адзначалася ў Пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, ёсць яшчэ недахопы. Бывае, напрыклад, што другародныя формулы, якіх дастаткова было б для азнаямлення толькі паведаміць студэнтам і расказаць, дзе прачытаць іх і як імі карыстацца, выкладчык выводзіць на працягу двух-трох гадзін. Здараецца таксама, што выкладчыкі старэйшых курсаў некаторых факультэтаў недастаткова выкарыстоўваюць значны аб'ём матэматычных, фізічных ці хімічных ведаў, якія выкладалі студэнтам на першых і другіх курсах.

Больш увагі кафедрам трэба звярнуць таксама на пытанні планавання вучэбнага працэсу, арганізацыі і кантролю за самастойнай работай студэнта. Тэарэтычная распрацоўка і практычнае ўкараненне навуковых асноў арганізацыі вучэбнага працэсу — цяпер адна з важнейшых задач вну. Трэба сур'ёзна заняцца вывучэннем бюджэта часу кожнага выкладчыка, рацыянальным выкарыстаннем яго магчымасцей з мэтай павышэння эфектыўнасці вучэбнай і навукова-даследчай працы. Пара назаўсёды пакончыць з растратай часу вучоных вну. Па-навуковаму таксама трэба арганізаваць працу студэнтаў з улікам спецыфікі факультэта. Студэнт не павінен разглядацца як пасіўны аб'ект навучання і выхавання, а як актыўны ўдзельнік гэтага працэсу.

Вялікае месца ў дакладзе было адведзена вучобе і выхаванню студэнтаў. Адзначалася, што асноўная маса студэнцтва добрасумленна выконвае ўзятыя перад дзяржавай абавязацельствы, выкарыстоўвае усе магчымасці для творчага авалодання выбранай спецыяльнасцю, займаецца напружана і старанна. Але значная частка моладзі, яшчэ лічыць дастатковым вучыцца толькі на здавальняюча. Такія студэнты дрэнна працуюць над сабой, а выкладчыкі і кіраўнікі факультэтаў не праяўляюць у такіх выпадках належнай патрабавальнасці.

А. Я. Малышаў даводзіць да ведама прысутных вынікі экзаменацыйнай зімовай сесіі. Па дзённаму навучанню ў сессі павінны былі ўдзельнічаць 5796 студэнтаў, з іх атрымалі водпуск па хваробе 112, абавязаны былі здаваць экзамены 5684 студэнты, але на экзамены з'явілася 5676, з іх здалі экзамены на выдатна 608, выдатна і добра — 1999, здавальняюча — 2204, нездавальняюча — 865. Такім чынам 54 працэнты студэнтаў паспяваюць толькі на здавальняюча ці атрымліваюць нездавальняючыя адзнакі. Яшчэ горшыя вынікі экзаменаў на вячэрнім аддзяленні. Там налічваецца 2850 чалавек, з іх акадэмічныя водпускі атрымалі 120, не з'явілася зусім на сесію 199, здавалі экзамены па усіх прадметах толькі 1689, з іх выдатныя адзнакі атрымалі 98, выдатныя і добрыя 489, здавальняючыя 1102, нездавальняючыя 842 студэнты, ці 34 працэнты ад усёй колькасці. Вядома, што такое становішча нас не можа задаволіць.

Прычына нізкай паспяховасці крыецца ў безадказных адносінах некаторых студэнтаў да вучобы, няўменне іх самастойна і плённа працаваць, Прычына яшчэ і ў тым, што заўважаецца паніжэнне адказнасці за паспяховасць студэнтаў з боку выкладчыкаў і кафедраў. Нельга прызнаць нармальным такое становішча, калі ў некаторых выкладчыкаў больш трэцяй часткі студэнтаў атрымліваюць нездавальняючыя адзнакі. Гэта брак у рабоце выкладчыка, сведчанне таго, што ён абмежаваў сваю работу толькі чытаннем курса і прыёмам экзаменаў і залікаў, а кафедры і дэканаты ўхіліліся ад кантролю за дзейнасцю выкладчыкаў.

Абавязкі выклладчыка на многа шырэй: ён павінен не толькі чытаць лекцыі і прымаць экзамены ці залікі, але і сістэматычна накіроўваць і кантраляваць самастойную работу студэнтаў шляхам правядзення калоквіумаў, кансультацый, індывідуальных сустрэч і гутарак. Кожны студэнт і выкладчык павінен быць у адказе за сваю працу і працу сваіх таварышаў.

Дакладчык падрабязна спыніўся на задачах практыкі студэнтаў і падкрэсліў, што яна, як правіла, павінна заканчвацца залікам ці экзаменам. Наогул, узрослыя праблемы вучэбнага працэсу неабходна ўважліва прадумаць і абмеркаваць на саветах факультэтаў ці ў метадычных камісіях.

Да праблем, якія неабходна вырашыць на шляху падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, адносяцца і такія, як удасканаленне падрыхтоўкі да прыёму моладзі ва універсітэт. За прыём на вучобу ў наш універсітэт патрэбна павысіць адказнасць дэканаў факультэтаў і загадчыкаў кафедрамі. Вядома, што моладзь іншы раз дапускае памылкі ў выбары свайго шляху, і ёй неабходна дапамога. Добрыя справы ў гэтым накіраванні робяць фізічны і матэматычны факультэты. Яны ўзгоднілі з Міністэрствам адукацыі БССР палажэнне аб завочнай фізіка-матэматычнай школе пры БДУ, якая разлічана на вучобу 500 вучняў 9—10 класаў сельскіх і раённых школ. Вопыт работы такіх школ пры маскоўскіх вну гаворыць аб іх вялікай патрэбе. Нам трэба зрабіць усё неабходнае для таго, каб гэты від дапамогі вучням калектывам нашага універсітэта рос і пашыраўся.

Немалую адказнасць за вучобу студэнтаў нясуць і грамадскія арганізацыі — камсамол і прафсаюз. Яны абавязаны праявіць актыўнасць, высокую патрабавальнасць да кожнага студэнта.

— Трэба прама сказаць,— заўважае прамоўца, — што, калі начале кафедры стаяць высокакваліфікаваныя вучоныя, добрыя арганізатары вучэбнай работы, там і поспехі студэнтаў добрыя. На такіх кафедрах забяспечваецца індывідуальны падыход да студэнтаў, улічваюцца іх схільнасці, цікаўнасць, яны прыцягваюць да навуковых даследаванняў кафедры.

Важнай мерай, прадугледжанай апошняй пастановай партыі і ўрада, з'яўляецца ўвядзенне з наступнага года для выкладчыкаў вну стажыроўкі на перадавых прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемствах, а таксама ў вядучых вышэйшых навучальных установах і навукова-даследчых інстытутах. Такое рашэнне дае магчымасць выкладчыку пазнаёміцца з апошнімі дасягненнямі навукі, гаспадаркі, прамысловасці і выкарыстоўваць усё гэта для навучальнага працэсу. Другая рэальная магчымасць удасканальвання ведаў выкладчыка — факультэты павышэння кваліфікацыі. Такі факультэт з 1 сакавіка створан і пры нашым універсітэце для выкладчыкаў фізікі і матэматыкі вну Беларусі і Прыбалтыкі. Тэрмін навучання на гэтых факультэтах — 4 месцы. Такім чынам, члены прафесарска-выкладчыцкага калектыва адзін раз у пяць год будуць мець магчымасць пабываць на факультэце павышэння кваліфікацыі. Кафедрам неабходна прадугледзець у сваіх планах пасылку выкладчыкаў на курсы, выкананне вучэбнага плана і аб'ёма работы ў сувязі з замяшчэннем выкладчыкаў, якія паехалі на курсы.

Вялікая размова вялася прамоўцам на Вучоным Савеце адносна падрыхтоўкі выкладчыкаў праз аспірантуру. Адзначалася, у прыватнасці, важнасць увядзення ў практыку падрыхтоўкі чытання цыкла лекцый па выбранай спецыяльнасці. Неабходна павысіць кантроль за работай дысертацый, працы над імі, а таксама абароны на вучоных саветах.

Вялікая гутарка вялася дакладчыкам і аб выхаванні студэнцкай моладзі. Маладыя спецыялісты, якія заканчваюць універсітэт, павінны не толькі валодаць навейшымі спецыяльнымі ведамі, але і быць загартаванымі ў духу высокай камуністычнай свядомасці, валодаць навыкамі арганізатарскай і выхаваўчай работы.

— Без дасканалага авалодання марксісцка-ленінскіх тэорый, грамадска-палітычнымі навукамі, без глыбокага разумення палітыкі партыі і ўрада, гаворыць прамоўца, ні адзін спецыяліст не можа справіцца са складанымі і шматграннымі задачаму будаўніцтва камунізма. Кожнай кафедры, кожнаму факультэту патрэбна крытычна перагледзець увесь навучальны працэс і распрацаваць план яго ўдасканалення на навуковай аснове.

Няма сумнення ў тым,— сказаў у заключэнне А. Я. Малышаў, што калектыў нашага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна з поспехам справіцца з задачамі, што стаяць перад ім.

Выступіўшыя ў спрэчках прамоўцы адзначылі, што важнай умовай павышэння якасці выпускаемых універсітэтам спецыялістаў з'яўляецца самастойная праца студэнтаў, павышэнне патрабавальнасці кожнага выкладчыка да моладзі, паступаючай на вучобу ў наш вну, далейшае ўмацаванне сувязей БДУ з вытворчасцю, сярэднімі школамі і аказанне актыўнай дапамогі ім у падрыхтоўцы школьнікаў да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Прафесар В. Г. Вафіядзі, ў прыватнасці, гаварыў аб паўсядзённым выхаванні высокай культуры ў студэнтаў, умацаванні іх дысцыпліны, аб арганізацыі больш эфектыўнай вытворчай практыкі. Спалучэнне тэарэтычнага і практычнага навучання—гэта выдатная асаблівасць савецкай школы, яе патрэбна развіваць.

У заключэнне выступіў рэктар універсітэта заслужаны дзеяч навукі БССР акадэмік А. Н. Сеўчанка. Ен спыніўся на тым, што ўрадавая ўзнагарода пашырыла абавязкі ўсяго калектыва БДУ. Мы павінны прыкласці усе намаганні для таго, каб дастойна сустрэць 50-годдзе Савецкай улады. Прафесарска - выкладчыцкаму калектыву неабходна ў самы бліжэйшы час узяцца за падрыхтоўку і выданне новых вучэбных дапаможнікаў па матэматыцы, фізіцы і іншых дысцыплінах. У нас усё яшчэ мала дактароў навук, а многія кафедры маюць усе магчымасці падрыхтаваць іх больш.

— Я сам,—падкрэсліў у заключэнне прамоўца,—бяру абавязацельства падрыхтаваць у бліжэйшыя 2—3 гады 4—5 дактароў навук. Дадатковыя, канкрэтныя сацыялістычныя абавязацельствы павінен узяць кожны прафесар.

На Вучоным Савеце была прынята адпаведная пастанова, накіраваная на далейшае паляпшэнне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, развіццё навуковых даследаванняў.



*Выдатнік вучобы Мікалай Кібальнік праводзіць даследаванні.*

*У адной з лабараторый фізфака ідуць практычныя занняткі па вывучэнню накіраванага дзеяння антэн.*

Фота А. КАДЗЕТА.





НА ЗДЫМКУ: студэнтка IV курса хімічнага факультэта Света ПАШКОЎСКАЯ і лабарант Ігар МІРАНЕНКА ў час практычных заняткаў па аналітычнай хіміі.

# НАШ ПАРОЛЬ—НЕСПАКОЙ

31 красавіка ў актавай зале галоўнага корпуса ўвесь шматлікі камсамольскі актыў універсітэта сабраўся на сваю чарговую тэарэтычную канферэнцыю. З дакладам «Аб выніках IV Пленума ЦК ЛКСМБ і задачах універсітэцкай камсамоліі на бліжэйшы перыяд» выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. М. Жабіцкі. Ён расказаў аб велічнай ролі, якую адыгрывае сёння ўся студэнцкая моладзь рэспублікі ў камуністычным будаўніцтве, ахарактарызаваў дзейнасць многіх камсамольскіх арганізацый вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і асобна спыніўся на поспехах і недахопах камсамольскай арганізацыі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Сканцэнтраваўшы асаблівую ўвагу на пытаннях ваенна-патрыятычнай і выхаваўчай работы, Г. М. Жабіцкі зазначыў, што камсамольцам універсітэта ў гэтым кірунку неабходна прыкласці значна больш намаганняў, каб 50-годдзе Вялікага Кастрычніка сустрэць на дастойным узроўні.

Пытанні вучобы, быту, арганізацыі мерапрыемстваў, палітычнага выхавання студэнтаў — усё гэта знайшло месца ў дакладзе першага сакратара. Не выпадкова, што ў спрэчках па дакладу было многа выступаючых. Кожны з іх у тым ці іншым аспекце стараўся прааналізаваць прычыны многіх недахопаў у дзейнасці камітэта камсамола універсітэта і ўсёй арганізацыі ў цэлым.

Аб падрыхтоўцы высокаякасных спецыялістаў у сценах універсітэта гаварыла сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта О. Буланчыкава. У прыватнасці, яна адзначыла, што кожны студэнт павінен фарміраваць сябе не толькі як спецыяліста, але і як педагога, таму што большасці выпускнікам прыдзецца працаваць у школах, дзе педагагічныя здольнасці будуць адыгрываць важнейшую ролю ў выхаванні малодшага пакалення. І ўжо сёння, гаворыць выступаючая, студэнт павінен цясней сутыкацца з канкрэтнымі праяўленнямі сваёй будучай прафесіі: шырэй выкарыстоўваць мажлівасці педагагічнай практыкі, сустракацца і гутарыць з вопытнымі настаўнікамі, прадстаўнікамі органаў народнай асветы рэспублікі. Гэта дапаможа ў некаторай ступені пазнаць тыя цяжкасці, якія могуць напаткаць у будучым кожнага, і зрабіць усё магчымае ўжо сёння, каб прадухіліць тэтыя цяжкасці.

Б. Замскі расказаў аб рабоце СНТ, старшынёй якога ён з'яўляецца і адзначыў, што многія студэнты універсітэта яшчэ стаяць у баку ад навуковай і даследчай работы, і ў гэтым ёсць некаторае ўпушчэнне з боку камітэта камсамола.

Аб тым, што камсамольскія актывісты мала выступаюць са сваімі праблемнымі матэрыяламі на старонках насценных і шматтыражнай газет, гаварыў рэдактар «Хіміка» Г. Кажушкоў.

Не меншае месца на канферэнцыі займалі і пытанні аб падборы камсамольскіх кіраўнікоў, што мае вялікае значэнне для дзейнасці ўсёй арганізацыі.

Сакратар парткома універсітэта Т. Я. Дударава ў сваім выступленні спыніла асаблівую ўвагу на тым, што многія камсамольцы стаяць у баку ад грамадскіх інтарэсаў, а некаторыя нават не чытаюць газет, не наведваюць тэатры; не выключаны са студэнцкага жыцця і факты амаральных учынкаў. Гэта, — гаворыць Т. Я. Дударава, — не што іншае, як вынік зніжэння патрабавальнасці да кожнага з камсамольцаў. Многія студэнты-камсамольцы страцілі пачуццё адказнасці, не даюць ацэнкі сваім учынкам. Адсюль яшчэ вялікая колькасць ва універсітэце двоечнікаў і троечнікаў. А ў нас жа ёсць усе магчымасці, зазначае прамоўца, ліквідаваць гэтыя недахопы.

Выступаючых на канферэнцыі было многа, і кожны з іх быў ахоплен адной мэтай: сустрэць слаўнае 50-годдзе Кастрычніка моцнымі духам і ўпартымі ў творчай працы.

К. ГОРСКІ.

## З ІМЕМ ЛЕНІНА

*З кожным днём у нашым універсітэце шырыцца падрыхтоўка да вялікай падзеі ў нашым жыцці — 97-ай гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна. На курсах, факультэтах, у інтэрнатах афомлена многа цікавых наглядных дапаможнікаў, якія дэталёва расказваюць аб слаўным жыцці Уладзіміра Ільіча, аб студэнцкіх гадах, аб яго рэвалюцыйнай барацьбе і дзейнасці ў гады Савецкай улады.*

*Партком сумесна з камітэтам камсамола і іншымі грамадскімі арганізацыямі універсітэта арганізаваў таксама прагляд моладдзю шэрага дакументальных фільмаў пра Леніна. Сёння, напрыклад, а 13 гадзіне ў актавай зале галоўнага корпуса будуць дэманстравацца цікавыя старонкі з жыцця правадыра — «Вечна жывы», «Мы бачылі Леніна», «Тут друкавалася «Искра» і іншыя. Дакументальныя фільмы будуць дэманстравацца да 21 красавіка.*

*Б. ІВАНОЎ.*



Першакурсніца.
Фота А. Кадзета.

СТУДЭНТ ЮБІЛЕЙНАГА ГОДА

# ПЕРАМОЖЦАМ БЫЦЬ НЯЛЁГКА

ГІСТОРЫК, ЯКІ ЁН? Простае на першы погляд пытанне, але на яго адкажаш не адразу. Пачнем са знешнасці. Здавалася, што адрозніць належнасць студэнта да таго ці іншага факультэта нельга. Гісторыкі, безумоўна, не маюць сваёй формы. Аднак давайце больш пільна прыгледзімся да шумлівага і стракатага патоку юнакоў і дзяўчат, якія кожны дзень спяшаюцца ва універсітэцкі гарадок. Вось ідзе вялікая група студэнтаў. Яны аб нечым спрачаюцца, дыскусіруюць. Агульнавядома, што гісторыкі — самыя заядлыя аматары спрэчак. Гісторык спрачаецца усюды і заўсёды, матэрыялу для дыскусій у яго шмат. Гэта карысна, гэта для ісціны . «Ісціна ж нараджаецца ў спрэчках», — гаворыць народная пагаворка. А гісторыя не любіць няпраўды.

І яшчэ адна асаблівасць гісторыкаў — у кожнага «спальныя» партфелі. Бадай у кожным з іх ляжыць вялікая «навуковая» праца. А магчыма, гэта не гісторык?..

Паднімаемся на пяты паверх галоўнага корпуса, дзе размясціўся гістфак. Мы не памыліліся: сустрэтая намі група юнакоў і дзяўчат прайшла ў кабінет усеагульнай гісторыі, каб тут ужо на практычным занятку знайсці зерне святой ісціны.

Пяты паверх поўнасцю «аддадзены» гістарычнамі факультэту. Вось насценная газета «Гісторык», побач — «Камсамольскі пражэктар». «Пражэктар» асляпляльна яркі, ён пранізвае многія аспекты дзейнасці і жыцця факультэта. Але і ён не можа ўсё асвятліць...

### У ПОШУКАХ ІСЦІНЫ

Вучоба для студэнта — галоўны абавязак. Паглядзім на гісторыка з гэтага боку. Каб не вяртацца далёка ў мінулае, возьмем для прыкладу апошнюю сесію. Тут асабліва вызначыўся другі курс (72 студэнты). Дзевяць выдатнікаў, восем — троечнікаў. Астатнія здаюць на выдатна і добра.

Цяпер давайце звернемся да факультэцкай статыстыкі. Яна дапаможа зрабіць наступны вынік: кожны дзевяты на факультэце з'яўляецца выдатнікам. Не буду хваліцца, але справядліва зазначу, што не кожны факультэт можа ганарыцца гэтым.

### СПОРТ І ГІСТОРЫК

Мінскае возера. Роўныя дарожкі парка Перамогі. Тут двойчы ў год праводзяцца агульнауніверсітэцкія кросы. Забег гісторыкаў. Другі круг дыстанцыі. Шчыльнай масай бягуць хлопцы. Наперадзе ўсіх, амаль на паўкруга, бяжыць ходарлявы юнак. Гэта Фёдар Ляоненка. Спартыўная слава гэтага студэнта далёка вядома за межамі нашай рэспублікі...

Падводзяцца вынікі кроса. Першае месца зноў за гісторыкамі. І ўжо ў каторы раз! У гэтым яны, бадай, не маюць сабе роўных ва ўсім універсітэце. «У масавасці наша сіла!» — гавораць гісторыкі.

Так заваёўваецца чарговая спартыўная ўзнагарода факультэта. У нас маецца шмат самых розных кубкаў, медалёў і ганаровых грамат — сведка слаўных спартыўных бітваў, з якіх гісторыкі выходзілі пераможцамі.

А хто ва універсітэце не ведае выдатных лёгкаатлетаў Тацяну Кавалёву, Аляксандра Якубоўскага, Віктара Пятрова, валейбалістаў Барыса Шабановіча, Яўгена Брыгадзіра, Леаніда Гваздзя, гімнастку Ларысу Шыманскую, шахматыстаў Мікалая Галедзюка і Леаніда Лойку, цяжкаатлета Мікалая Бондара, веласіпедыста Паўла Бондара?!

### ВОСЬ ГЭТА МАСТАКІ

Актавая зала...

Народу — бітком. На аглядзе філолагі і гісторыкі, даўнішнія непрымірымыя сапернікі. Барацьба за першае месца разгарнулася ўпарта і самааддана. Гісторыкам прыходзіцца цяжка. Ядро самадзейнасці — пяты і чацвёрты курсы, выпускныя. У іх шмат працы над дзяржаўнымі экзаменамі, дыпломнымі. Яны ў аглядзе не ўдзельнічаюць, Уся надзея на малодшых. Як яны? Але моладзь не падвяла. Першае месца заваявана. У гэтым вялікая заслуга Мікалая Бондара і Веры Фацеевай. Яны аддалі многа сіл і энергіі, каб стварыць моцны, любячы мастацтва, сцэну калектыў.

Ітак, у гэтым годзе гісторыкі зноў на агульнауніверсітэцкім аглядзе занялі першае месца.

Гэта ў дзесяты раз запар!

### КАЛІ ПАКЛІЧА ТРЭЦІ СЕМЕСТР...

Стэпавы пыл. Гарачыня такая, нібы нехта незнарок побач распаліў вялікі агонь. Голы, магутны, бяскрайні ляжыць стэп. Здаецца, у такіх абставінах нельга не толькі працаваць, але і наогул доўга жыць. Але тут вырашылі размясціцца лагерам гісторыкі-будаўнікі атрада «Вікторыя».

Заданне — пабудаваць пяць жылых дамоў і дзве кашары для жывёлы. Цяжка, вельмі цяжка ў такіх абставінах працаваць. Гарачы вецер не прыносіць ні на хвіліну ніякага аблягчэння. А ноччу — духата ад разагрэтага за дзень паветра і зямлі.

Аднак гісторыкі перамаглі ўсё: і гарачыню, і смагу, і надакучлівых камароў.

Вынік — замест пяці пабудавалі восем жылых дамоў, замест двух — чатыры кашары, плюс — дзве капітальна адрамантавалі. Так паявілася ў Чапаеўскім раёне цэлая вуліца з прыгожымі светлымі дамамі. Жыхары назвалі яе — Беларускай. Атрад «Вікторыя» заваяваў першае месца сярод студэнцкіх будаўнічых атрадаў і Чырвоны пераходны сцяг, багатую калекцыю ганаровых грамат і ўзнагарод.

Гэта было ў мінулым годзе, а сёлета гісторыкі зноў збіраюцца на цаліну — і зноў толькі перамагчы, заваяваць першае месца. Дэвіз жа гісторыкаў — «Лепш быць першым, чым другім».

### ЯКІ ЎСЁ Ж ГІСТОРЫК!

Адказ на гэтае пытанне ёсць: ён заўсёды ў пошуках ісціны. Ён здольнымі рукамі археолага раскопвае Мінскае замчышча, ліха танцуе на сцэне, не горш прафесіянальнага артыста. Яго вы сустрэнеце ў піянерскім лагеры пад Брэстам, у будаўнічым атрадзе Цюменскай вобласці. Ён рыецца ў сховішчах архіва і выступае агітатарам перад рабочымі, калгаснікамі. Ён усюды, там, дзе патрэбны гарачыя сэрцы, глыбокія разважанні, умелыя рукі. Карацей—гісторык заўжды там, дзе стварaецца гісторыя.

А. КОРЧАШКА.

*АД РЭДАКЦЫІ: Мы раздзяляем радасць аўтара гэтага артыкула аб поспехах гісторыкаў у вучобе, працы, арганізацыі культурнага адпачынку і іншых галінах іх шматграннага, на самай справе змястоўнага жыцця. Але, на наш погляд, нават самыя вялікія поспехі не павінны адцягваць увагу ад тых недахопаў, якія маюць яшчэ месца на факультэце.*

*Гутарка ў першую чаргу ідзе аб тым, што, хаця за апошні семестр колькасць выдатнікаў сярод гісторыкаў павялічылася, на факультэце ў цэлым паспяховасць панізілася, больш стала двоечнікаў. Камітэт камсамола гістфака прымае меры для таго, каб ліквідаваць недахопы. Але ж у гэтым напрамку выкарыстоўваюцца пакуль што не ўсе магчымасці. Хацелася б, каб і універсітэцкі камітэт камсамола больш удзяляў увагі пытанням вучобы і паспяховасці студэнтаў-гісторыкаў.*

# Добры дарадчык—«Веды»

Кафедра прыродазнаўчых навук (загадчык Ул. М. Стрэльчанка) падрыхтоўчага факультэта наладзіла выпуск насценгазеты «Веды», якая знаёміць замежных студэнтаў з жыццём і навуковай дзейнасцю выдатнейшых рускіх і савецкіх вучоных фізікаў, хімікаў, біёлагаў, матэматыкаў і іншых. На яе старонках можна прачытаць таксама і інфармацыі аб выдатных замежных вучоных, якія шмат зрабілі для развіцця гэтых навук. Газета рэгулярна змяшчае задачы, цікавыя галаваломкі, загадкі, разгадаць якія замежным студэнтам не так проста; ім прыходзіцца звяртацца да розных даведвальнікаў і нават часам да энцыклапедыі. «Веды» багата ілюстравана. Таму не дзіўна, што яна карыстаецца вялікай папулярнасцю і кожны чарговы выхад яе з нецярпеннем чакаюць замежныя студэнты.

# ПРЫСВЕЧАНЫ МІНСКУ...

Школа рабочай моладзі № 7 трактарнага завода запрасіла студэнтаў падрыхтоўчага факультэта на вечар, прысвечаны 900-годдзю ардэнаноснага Мінска. Там яны даведаліся аб гісторыі горада, аб яго слаўных рэвалюцыйных традыцыях, аб гераічнай барацьбе мінчан у гады Вялікай Айчыннай вайны супраць фашысцкіх захопнікаў. Шмат цікавага расказалі ім у выступленнях прамоўцы аб стваральнай працы сталіцы цяпер, аб яго падрыхтоўцы і падарунках 50-годдзю Савецкай улады.

Замежныя сябры былі не толькі слухачамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі вечара. Яны сваімі сіламі далі захапляючы канцэрт. Больш гадзіны рабочая моладзь, запрошаныя госці горада слухалі нацыянальныя песні дзесяці замежных краін. Пад гарачыя апладысменты студэнты нашага універсітэта выканалі савецкія песні «Крыніцы», «Вечар на рэйдзе», песню з кінафільма «Два байцы» і многа іншых. У заключэнне яны цудоўна выканалі танец «Казачок...

Зала доўга не сціхала. Апладысменты. Авацыі, чуваць словы «Ма-лай-цы!».

На вечары адчуваліся непаўторная абставіны таварыскасці і сяброўства.

І. КАЗАКОЎ.



На парадку дня пасяджэння мясцкома—спартыўная работа.
Фота А. КАДЗЕТА.

# ДЛЯ ВАС, СТУДЭНТЫ

## У ПРАФКОМЕ МАЮЦЦА ПУЦЁЎКІ Ў САНАТОРЫІ

| № | Назвы санаторый | Тэрмін | Колькасць | Сума, даплачваемая студэнтамі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Санаторый «Нарач» | 6.4.67 г.— 1.5.67 г. | 1 | 37 р. 80 к. |
| 2 | Амбулаторнае лячэнне «Пяцігорск» | 12.4.67 г.— 7.5.67 г. | 1 | 29 р. 10 к. |
| 3 | Санаторый Горкага — Вялікі фантан | 12.4.67 г.— 7.5.67 г. | 1 | 31 р. 80 к. |
| 4 | Санаторый «Сігулда» | 20.4.67 г.—13.5.67 г. | 2 | 33 р. 00 к. |
| 5 | Санаторый «Расія-Кіславодск» | 31.5.67 г.—25.6.67 г. | 1 | 34 р. 50 к. |
| 6 | Санаторый «Нарач» | 23.6.67 г.—18.7.67 г. | 1 | 37 р. 80 к. |
| 7 | » «Лётцы» | 24.6.67 г.—19.7.67 г. | 1 | 34 р. 50 к. |
| 8 | » «Светлагорск» | 25.6.67 г.—20.7.67 г. | 1 | 34 р. 50 к. |
| 9 | Амбулаторнае лячэнне «Алушта» | 27.6.67 г.—20.7.67 г. | 1 | 29 р. 10 к. |
| 10 | Пансіанат «Драудзіба» | 28.6.67 г.—21.7.67 г. | 1 | 31 р. 50 к. |
| 11 | Санаторый «Крыніца» | 28.6.67 г.—23.7.67 г. | 1 | 37 р. 80 к. |
| 12 | Амбулаточнае лячэнне «Сочы-Мацэста» | 29.6.67 г.—24.7.67 г. | 1 | 33 р. 00 к. |

# КІРАЎНІК

*Толькі што закончыліся заняткі, наперадзе яшчэ многа спраў у студэнтаў нашага універсітэта. Адны спяшаюцца ў бібліятэку, каб першымі атрымаць неабходную літаратуру і сумленна падрыхтавацца да семінарскіх заняткаў, другія спяшаюцца ў кінатэатры паглядзець новы мастацкі фільм. Але больш усяго турбот у тых, хто пастаянна выконвае вялікую грамадскую работу.*

*Спяшаецца і наш студэнт Віктар Озераў. Куды?*

*Зразумела: на пляцоўку, дзе праходзяць заняткі па парашутнаму спорту. Яго там чакаюць спартсмены — парашутысты. Ён кіруе гэтай секцыяй.*

*Да паступлення ва універсітэт на аддзяленне журналістыкі Віктар служыў у Савецкай Арміі. На яго ліку дзесяткі самастойных скачкоў з парашута,*

# ПАРАШУТНАЙ

*якія ён рабіў не толькі днём, а нават і ноччу. З таго часу і зарадзілася ў яго сэрцы любоў да парашутнага спорту.*

*— А што, калі арганізаваць парашутную секцыю пры універсітэце? — яшчэ на першым курсе (у мінулым годзе) пачаў думаць Віктар.*

*Ён ведаў, што гэта справа нялёгкая, але ўсё магчыма, калі ёсць жаданне. Віктара горача падтрымалі ў камітэце ДТСААФ. Пачалася старанная падрыхтоўка матэрыяльнай базы. Але і гэта было зроблена. І вясной мінулага года парашутная секцыя ўжо пачала дзейнічаць. Жадаючых зрабіць першы крок у неба было многа, асабліва на матэматычным факультэце.*

*У гэтым годзе зноў пачала працаваць парашутная секцыя. Лік студэнтаў у параўнанні з мінулым годам узрос амаль у два разы. Сярод іх большасць*

# СЕКЦЫІ

*студэнтаў першых курсаў. Зараз каля 90 чалавек з розных факультэтаў паспяхова вывучылі матэрыяльную частку парашута, яго ўкладку. Настаў самы адказны час у нашых спартсменаў — скачкі з парашута. Аб гэтым ведае кіраўнік Віктар Озераў. Пакуль што трэба навучыцца скакаць з вышак, папрацаваць на трэнажорах.*

*Уперадзе — напружаныя дні, хваляванні. Хвалюецца крыху і сам кіраўнік за сваіх навучэнцаў. Пройдзе некалькі тыдняў і студэнты зробяць першыя крокі ў воблачнай вышыні.*

*Спяшаюцца студэнты... Спяшаецца і студэнт другога курса аддзялення журналістыкі Віктар Озераў, каб своечасова правесці заняткі.*

*На здымку: студэнты першага курса Алег Кунаеў з біяфака і Таня Краўчанка з філфака уважліва сочаць за сваім кіраўніком парашутнай секцыі Віктарам Озеравым, які паказвае, як правільна выканаць зацяжку строп.* *Фота і тэкст І. АСКІРКІ.*



# НАШЫ МУШКЕЦЁРЫ

Дваццаць пятага і дваццаць восьмага сакавіка ў спартыўнай зале корпуса радыёфізікі і электронікі было праведзена асабіста-каманднае першынство універсітэта па фехтаванню. У мужчынскіх відах поўную перавагу паказалі фізікі. На першае месца па рапіры выйшаў кандыдат ў майстры інжынер фізічнага факультэта Міхаіл Ксенафонтаў, які не меў ніводнага паражэння. Другое месца заваяваў выпускнік гэтага ж факультэта Георгій Станкевіч і трэцяе— Марык Ліўшыц (III курса фізфака).

У паядынках майстроў саблі на першае месца выйшаў майстар спорту Марк Ліўшыц (IV курс фізфака), на другое — І. Баранаў (І курс аддзялення радыёфізікі), і на трэцім месцы аказаўся мацнейшы наш сабліст майстар спорту Леанід Рабчыкаў (V курса філфака). Па фехтаванню на шпагах сваю поўную перавагу паказаў Георг Станкевіч, які лёгка выйграў усе баі. Другое месца заняў Юрый Прыймаў (V курс матфака), на трэцім — Віктар Сасенка (II курс фізфака).

Сярод жаночых каманд на вышэйшую ступеньку першынства паднялася студэнтка II курса філфака Наташа Уткіна, другое месца дасталася студэнтцы III курса біяфака Галіне Макаранка, трэцяе — ветэрану зборнай універсітэта аспірантцы хімфака Раісе Орышавай.

Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: фізічны, філалагічны, матэматычны, хімічны, гістарычны факультэт.

# АСПІРАНТЫ І СПАБОРНІКІ ТРЫМАЮЦЬ ЭКЗАМЕН

**Наш універсітэт па праву называюць кузняй навуковых кадраў. Штогод ён падрыхтоўвае дзесяткі аспірантаў па самых розных дысцыплінах, якія з поспехам працуюць выкладчыкамі ў вышэйшых навучальных установах не толькі нашай рэспублікі, але і ва ўсёй краіне. Акрамя гэтага, пры аспірантуры БДУ налічваецца каля 800 спаборнікаў.**

**Днямі 30 аспірантаў і спаборнікаў паспяхова здалі кандыдацкі экзамен па марксісцка-ленінскай філасофіі і гісторыі філасофіі. Добрыя веды паказалі У. Т. Піскун, Ю. С. Булкін, С. А. Габрусевіч і іншыя.**

**А. ФЁДАРАЎ.**

# НАВІНЫ * ПАДЗЕІ * ФАКТЫ

**Кафедра фізіялогіі раслін арганізавала цікавую гутарку для замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта «Аб паходжанні жыцця на Зямлі». Яе зрабіў загадчык кафедры дацэнт Сяргей Уладзіміравіч Калішэвіч. Ён ілюстраваў свой расказ шматлікімі нагляднымі дапаможнікамі і цікавымі доследамі. Студэнты задавалі шмат пытанняў, на якія атрымалі пераканаўчыя адказы.**

* * *

**На першым курсе аддзялення журналістыкі адбыўся сход. На яго былі запрошаны дэкан факультэта дацэнт Р. В. Булацкі, дацэнты Л. А. Шаўчэнка, М. Я. Цікоцкі, М. С. Зярніцкі і іншыя, а таксама куратары курса. Асноўнымі пытаннямі на сходзе былі пытанні дысцыпліны і вучобы. У прыклад ставіліся выдатнікі вучобы Люда Гаражанкіна, Васіль Гурын. Справядлівай крытыцы былі падвергнуты Ала Папова, Галіна Гарэлік і іншыя студэнты, якія несур'ёзна ставяцца да вучобы: не рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў, спазняюцца на лекцыі і, горш таго, амаль палову з іх прапускаюць.**

* * *

**Хутка пройдзе два месяцы, як у нашым універсітэце пачаўся абмен камсамольскіх білетаў. Цяпер можна агляну́цца назад і паглядзець, як жа праходзіць гэтае важнае палітычнае мерапрыемства. Штабам па абмену камсамольскіх дакументаў з'яўляецца камітэт камсамола БДУ. Тут шмат нагляднай агітацыі аб першых камсамольцах, аб героях-камсамольцах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, а таксама слаўных традыцыях камсамольскай арганізацыі універсітэта. Калектывам камітэта зроблена ўсё для таго, каб абмен білетаў праходзіў ва універсітэце па-святочнаму, урачыста і арганізавана. Поспехі ў гэтым ужо ёсць добрыя. Атрымалі камсамольскія пашпарты студэнты біялагічнага, геолага-геаграфічнага, філалагічнага факультэтаў, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, а цяпер на паверцы — гістарычны. Усяго новыя камсамольскія білеты атрымалі 1952 студэнты.**

* * *

**На чарговым пасяджэнні групы народнага кантролю нашага універсітэта разгледжана пытанне аб правільнасці размеркавання грашовых сродкаў на набыццё маёмасці для факультэтаў. Пасля абмеркавання прынята адпаведная пастанова.**

* * *

**У Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі быў арганізаваны для савецкіх і замежных студэнтаў універсітэта прагляд кінафільма «Паднятая цаліна» па аднайменнаму раману Міхаіла Шолахава.**

* * *

**На філалагічным факультэце 4 красавіка адбылася першая абарона дыпломных работ выпускнікамі-журналістамі юбілейнага года. На гэтую ўрачыстасць у кабінет друку сабраліся выкладчыкі, студэнты, каб паслухаць і абмеркаваць справаздачы «абаронцаў». Што ж, пачатак нядрэнны: большасць з дыпламантаў атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі.**

**Рэдактар М. І. ІОСЬКА.**

АТ 17310 Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 699